**С. Я. Новікаў**

# НАЦЫСЦКАЯ ПАЛІТЫКА ЭКАНАМІЧНАГА ГЕНАЦЫДУ Ў ДАЧЫНЕННІ ДА ГРАМАДЗЯНСКАГА НАСЕЛЬНІЦТВА АКУПАВАНАЙ БЕЛАРУСІ (1941–1944)

В публикации осуществляется анализ состояния документальных источников и результатов проведенных научных как белорусских, так и немецких исследований по истории экономического геноцида гражданского населения в годы германской оккупации Беларуси. Автор приходит к выводу, что многие категории людей на оккупированной территории из объектов нацистской экономической политики превратились в главный субъект рабского труда на местах. Наиболее масштабным являлось привлечение жителей белорусской деревни к выполнению обязательных продовольственных поставок для германского вермахта.

Даследаванне фактычных наступстваў правядзення нацысцкай палітыкі эканамічнага генацыду ў адносінах грамадзянскага насельніцтва Беларусі стала ў парадак дня беларускіх гісторыкаў толькі ў пачатку бягучага стагоддзя. Дзякуючы калектыўнай працы, падрыхтаванай гісторыкамі і архіўнымі работнікамі, адзначанай Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь 2002 года [1; 2; 3; 4; 5], як бясспрэчны факт у грамадскім наратыве ўпершыню апынуліся амаль чатырыста тысяч беларускіх грамадзян, вывезеных у Германію, якіх выкарыстоўвалі там на самых розных прымусовых працах у 1942–1945 гг. «Беларускія остарбайтары», як іх сёння называюць, выціснутыя на шматлікія гады з масавай свядомасці, але захаваныя ў памяці людзей у пасляваенны час, толькі праз дзесяцігоддзі былі вернуты ў цэнтр гістарычнага і навуковага наратываў. Дзякуючы часу іх удалося канчаткова вывесці з доўгага «ценю» грамадскага замоўчвання і разам з тым уключыць у інстытуяваную сістэму гістарычнай адукацыі, а таксама захавання ў гістарычнай памяці беларускага народа суверэннай рэспублікі.

У той час гэтага яшчэ нельга было сказаць у адносінах тых, хто ў гады трохгадовай германскай акупацыі апынуўся на тэрыторыі Беларусі. Прайшло больш за паўвека пасля завяршэння Вялікай Айчыннай вайны, але тэма прымусовай працы на месцах заставалася фактычна не асэнсаванай ні навукай, ні грамадствам, ні дзяржавай. Хоць у колькасным вымярэнні гэтыя людзі пакінулі не менш глыбокі след у гісторыі ваеннай паўсядзённасці, але былі «выштурхнуты» з беларускай савецкай гістарыяграфіі. Пры гэтым шматлікія факты выкарыстання мясцовага насельніцтва ў якасці працоўнай сілы на розных аб’ектах ваеннай, прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці, лясной гаспадаркі і іншых сфер працоўнай эксплуатацыі дакументальна адлюстраваны ў шматлікіх гістарычных матэрыялах пачынаючы з летніх месяцаў 1941 г. Пра гэтых людзей афіцыйная беларуская гістарычная навука згадвала толькі ўскосна, пакідаючы на другасным плане, г.зн. без усебаковага вывучэння, аналізу і ацэнкі [6]. У той час як у колькасным вымярэнні гэта

катэгорыя ахвяр эканамічнага генацыду значна пераўзыходзіла тых, хто за гады акупацыі ў якасці остарабайтараў быў вывезены на прымусовыя работы ў германскі рэйх.

Таму ў пачатку XXI ст. для даследчыкаў ваеннай гісторыі не было дзіўным тое, што да апошняга часу ў беларускай гістарыяграфіі адсутнічала спецыяльнае даследаванне аб маштабах, характары і асаблівасцях працы мясцовага насельніцтва, якое ваеннымі і грамадзянскімі органамі акупацыйнай улады не толькі шырока прыцягвалася, але і татальна эксплуатавалася ў рэжыме ваеннай паўсядзённасці. Заўважым, што гэта задача засталася фактычна не вырашанай ў ходзе падрыхтоўкі ў пачатку нулявых гадоў спецыяльнага дысертацыйнага даследавання «Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941–1944 гг.)» [7]. Паспяховая абарона дысертацыі, як ні дзіўна, пакінула без адказу галоўнае гістарычнае пытанне пра колькасць беларускіх грамадзян, занятых у рамках выканання «абавязковай працоўнай павіннасці» непасрэдна на акупаванай тэрыторыі [8].

Актуальнасць гэтай тэматыкі сёння разам з акадэмічнымі ўзмацняе і інфармацыйна-пазнавальны фактар. У гэтай сувязі аўтар артыкула вылучае задачу па аднаўленні цэльнай карціны правядзення нацысцкай палітыкі эканамічнага генацыду ў адносінах грамадзянскага насельніцтва Беларусі, якое ў гады германскай акупацыі стала не толькі аб'ектам, колькі адной з важных катэгорый яе ахвяр. Як вядома, яна ў гады германскай акупацыі знаходзілася ў падпарадкаванні розных ваенных, ваенна-паліцэйскіх і цывільных службаў пачынаючы з армейскага камандавання на паўночным усходзе Беларусі і завяршаючы органамі ўлады германскага рэйха на тэрыторыі Усходняй Прусіі на захадзе. Адзначым, што больш паловы беларускай тэрыторыі на захадзе і поўдні знаходзілася ў падпарадкаванні германскай цывільнай адміністрацыі, якая была ўстаноўлена ў форме гебітс- і крайскамісарыятаў і забяспечвала іх функцыянаванне на беларускіх тэрыторыях, уключаючы Усходнюю Прусію, рэйхскамісарыяты «Остланд» і «Украіна». Астатняя тэрыторыя знаходзілася ў зоне дзейнасці камандавання тылам групы армій «Цэнтр». Дакументы толькі вышэйзгаданых эканамічных органаў і іх асноўных гаспадарчых службаў, што існавалі ў кожнай згаданай інстанцыі, складаюць сёння даволі значную базу ключавых крыніц.

Крыніцазнаўчы і гістарыяграфічны аналіз праблемы патрабуе яе разгляду ў кантэксце выяўленага на цяперашні час масіву архіўных дакументаў і матэрыялаў, а таксама ўведзеных беларускімі і нямецкімі даследчыкамі ў навуковы зварот гістарыяграфічных фактаў. Адзінай работай, прысвечанай прымусовай працы на акупаванай беларускай тэрыторыі, якая ўтрымлівае вялікую колькасць арыгінальных дакументаў, у тым ліку нямецкага паходжання, з'яўляецца даследаванне «Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг.» (Мінск, 2010) [9]. Калектыўная манаграфія, падрыхтаваная прафесійнымі ваеннымі гісторыкамі ў канцы нулявых гадоў, вырашае шматлікія даследчыя, адукацыйныя і інфармацыйныя задачы.

Навуковую класіфікацыю працоўнай сілы, якая прыцягвалася да выканання работ на акупаванай тэрыторыі Беларусі, упершыню паспрабаваў даць беларускі магістрант, а зараз доктар філасофіі А. Я. Далгоўскі. З улікам таго, што мясцовая рабочая сіла выкарыстоўвалася рознымі германскімі акупацыйнымі службамі для работ як часовага, так і пастаяннага характару, даследчык падзяляе яе на наступныя катэгорыі, адлюстраваныя перш за ўсё ў шматлікіх дакументальных крыніцах: мясцовая рабочая сіла, якая 1) у прымусовай форме прыцягвалася ваенным камандаваннем ці грамадзянскімі ўстановамі на кароткі тэрмін для розных работ накшталт рыцця акопаў, чысткі дарог, уборкі снегу ці расчысткі завалаў; 2) размешчалася ў стацыянарных лагерах ці прыцягвалася да работ у рамках дзейнасці аддзелаў па арганізацыі рабочай сілы пры нямецкіх дывізіях ці выкарыстойвалася для выканання пастаянных работ на вытворчасці, нарыхтоўцы торфу, рубцы лесу ці на будаўнічых работах у арганізацыі «Тодта»; 3) складалася з яўрэяў, ваеннапалонных ці цыганоў (романаў) і прыцягвалася ваеннымі ці грамадзянскімі органамі нямецкай улады для выканання асобных работ з мэтай выкарыстання для знясілення і знішчэння гэтай катэгорыі людзей; 4) неаднаразова прыцягвалася нямецкімі службамі на кароткачасовыя работы на акупаванай тэрыторыі Беларусі [10, S. 41–42]. Заўважым, што гэты падыход у адносінах вызначэння «катэгорый прымусовай працы» істотна адрозніваецца ад нямецкага, прынятага ў сучаснай германскай гістарыяграфіі [11].

Аўтары далейшых беларускіх даследаванняў спрабавалі на аснове новых архіўных дакументаў і матэрыялаў паказаць розныя бакі малавывучанай тэмы. Значная ўвага надавалася розным відам работ у штодзённай практыцы тых, хто выконваў абавязковую прымусовую павіннасць, што з'яўлялася часткай праграмы прымусовага прыцягнення грамадзянскага насельніцтва да працы, якая характарызавала яго матэрыяльнае становішча і раскрывала механізмы мабілізацыі ў рэйх. Дзякуючы ўведзеным дакументам удаецца аднавіць у агульных рысах цэласную карціну функцыянавання на месцах акупацыйнага механізма прымусовага працавыкарыстання грамадзянскага насельніцтва [9, с. 22–89; 12, 13, 14,]. Розныя групы дакументальных матэрыялаў дазваляюць вызначыць адносіны людзей да агітацыйных і адміністрацыйных мерапрыемстваў германскіх акупантаў, што праводзіліся ў працоўнай сферы рознымі органамі ваеннай, ваенна-паліцэйскай і грамадзянскай улады.

Да выкарыстання працоўных рэсурсаў Беларусі грамадзянскія ўлады прыступілі з першых дзён акупацыі. Канкрэтныя задачы па прыцягненні мясцовай рабочай сілы вынікалі з «Дырэктыў па вядзенні гаспадаркі на новазанятых усходніх тэрыторыях», прынятых 16 чэрвеня 1941 г. [12, S. 133]. Адпаведна яму мясцовае насельніцтва павінна было ў абавязковым парадку прыцягвацца да выканання аднаўленчых работ і для забеспячэння бесперапыннага прасоўвання вайсковых часцей вермахта на ўсход. Камандаванне часцей і палявых камендатур павінна было сыходзіць з таго, што выкарыстанне мірнага насельніцтва можа ўплываць на правядзенне работ па ўборцы ўраджаю, а таксама на вытворчасць важнай у ваенным плане прадукцыі [15].

Распараджэннем імперскага міністра па справах акупаваных усходніх тэрыторый А. Розенберга ад 5 жніўня 1941 г. уводзілася ўсеагульная працоўная павіннасць для ўсяго насельніцтва ва ўзросце ад 18 да 45 гадоў, для яўрэяў – ад 14 да 60 гадоў [16, S. 452]. Улікам працаздольнага насельніцтва займаліся спецыяльна створаныя для гэтага аддзелы працы 20 акруговых камісарыятаў і біржы працы. Да лютага 1942 г. на тэрыторыі Генеральнай акругі Беларусь было створана 9 бірж – у Мінску, Баранавічах, Лідзе, Навагрудку, Слоніме, Вілейцы, Слуцку, Глыбокім і Ганцавічах. Рэгістарыцыя на біржах працы насіла абавязковы характар. Пад страхам голаду (працуючыя атрымлівалі харчовыя карткі) і пагроз насельніцтва вымушана было працаваць на прадпрыемствах, якія мелі галоўным чынам ваеннае значэнне, на будаўніцтве, рамонце і расчыстцы шашэйных і чыгуначных дарог, аэрадромаў, здабычы торфу, вырубцы і вывазе лесу, пры правядзенні розных сельскагаспадарчых работ і г.д. [2, с. 8–9].

Крах «бліцкрыгу» ў вайне супраць СССР стаў рубяжом, калі берлінскія стратэгі павінны былі ўносіць істотныя карэктывы ў акупацыйную палітыку на ўсходзе ўвогуле, у тым ліку ў ваенную эканоміку на месцах. З лістапада 1941 г. у аснову дзейнасці германскіх эканамічных органаў і гаспадарчых службаў ляглі «агульныя прынцыпы эканамічнай палітыкі на новазанятых усходніх тэрыторыях» [17]. У адпаведнасці з унесенымі зменамі вышэйшым законам далейшага вядзення вайны нацысцкае кіраўніцтва аб’яўляла «патрэбы ваеннай эканомікі» [18]. У ліку важных ваенна-эканамічных задач разам з харчовым забеспячэннем вермахта з рэсурсаў захопленых тэрыторый таксама называлася аднаўленне прамысловых вытворчасцяў, але ў першую чаргу – выкарыстанне мясцовых *людскіх рэсурсаў* з захопленай тэрыторыі СССР. Гэта датычылася як яўрэяў, так і ваеннапалонных, масавае знішчэнне якіх адбывалася ў тым ліку шляхам іх эксплуатацыі.

Ліквідацыя яўрэяў у рамках «канчатковага рашэння яўрэйскага пытання» выражалася таксама ў рабскай эксплуатацыі працаздольных прадстаўнікоў гэтай групы насельніцтва на акупаванай тэрыторыі Беларусі. 15 ліпеня 1941 г. эканамічны штаб «Ост» аддае распараджэнне, у адпаведнасці з якім яўрэі маглі прыцягвацца да выканання работ, калі яны займаліся вытворчасцю важнай «ваеннай прадукцыі», а таксама ў выпадку недахопу на месцах неяўрэйскай рабочай сілы [16, S. 57]. У сярэдзіне жніўня рэйхскамісар «Остланда» Лозэ падрыхтаваў дырэктывы, якія прадугледжвалі выкарыстанне працаздольных яўрэяў у якасці працоўнай сілы, стварэнне яўрэйскіх рабочых каманд і прыцягненне іх да работ за рысай гета [19]. Яўрэі ва ўзросце ад 14 да 60 гадоў актыўна выкарыстоўваліся на розных прымусовых работах, пра што пераканаўча сведчаць факты занятасці яўрэяў Мінскага гета вясной 1943 г. Ліквідацыя яўрэяў на акупаванай усходняй тэрыторыі да таго часу практычна была завершана, аднак сярод тых, хто быў заняты на рабочых аб’ектах акупаванага Мінска, 18,3 % складала менавіта яўрэйская працоўная сіла [14, с. 406].

Папаўнялі мясцовыя працоўныя рэсурсы і савецкія ваеннапалонныя, якія апынуліся на акупаванай тэрыторыі Беларусі. Калі пытанне аб прыцягненні да працы савецкіх ваеннапалонных на тэрыторыі самога рэйха на пачатковым этапе правядзення аперацыі «Барбароса» заставалася ў полі вострых дэбатаў сярод вышэйшага кіраўніцтва, то ў час руху вермахта па савецкай тэрыторыі ваеннапалонныя выкарыстоўваліся практычна з першых дзён на розных работах, асабліва пры расчыстцы руін і завалаў, ачыстцы дарог і мастоў, на пагрузачна-разгрузачных работах, у якасці рабочых у ваенна-будаўнічай арганізацыі «Тодта». Загадам генерал-кватэрмайстра вобласці тылу сухаземных войскаў В. Гофмана ад 2 жніўня 1941 г. было прадпісана «прыцягваць да работ усіх без выключэння савецкіх ваеннапалонных» [16, S. 792]. З устанаўленнем зоны армейскага тылу ствараюцца працоўныя зборныя лагеры, якія знаходзіліся ў Бабруйску, Барысаве, Віцебску, Гомелі, Жлобіне, Магілёве, Оршы [2, с. 9]. З ваеннапалонных фарміраваліся рабочыя каманды, час выкарыстання якіх залежаў ад аб'ёмаў выконваемых работ: адны з іх з'яўляліся стацыянарнымі, з доўгім тэрмінам знаходжання на тэрыторыі самога аб'екта ці побач з ім, але не ў распалажэнні дулага (Dulag) ці шталага (Stalag); іншыя каманды былі задзейнічаны толькі на дзённых работах. Апроч таго, паўздоўж лініі абароны нямецкіх воінскіх часцей фарміраваліся рабочыя калоны, рабочыя батальёны, рабочыя роты і рабочыя каманды, створаныя з грамадзянскага насельніцтва для выканання гаспадарчых работ і будаўніцтва абарончых умацаванняў [20].

Такім чынам, з пачаткам германскай акупацыі савецкія ваеннапалонныя і мясцовае грамадзянскае насельніцтва, у тым ліку яўрэі, якія апынуліся на захопленай тэрыторыі Беларусі, у рознай ступені прыцягваліся да выканання тых ці іншых работ. Ужо з канца 1941 г. усе працаздольныя павінны былі ў першую чаргу забяспечваць патрэбы ваеннай эканомікі рэйха, для чаго ўся мясцовая рабочая сіла падзялялася на 5 катэгорый: рабочую сілу, 1) якая павінна была выкарыстоўвацца для вырашэння неадкладных задач ваенных часцей, акупацыйных ваенных і грамадзянскіх органаў улады; 2) занятая вытворчасцю ўзбраенняў і вайсковай амуніцыі; 3) якая прымянялася для вырашэння задач харчовага забеспячэння і правядзення сельскагаспадарчых работ; 4) занятая на вытворчасці, «важнай для нямецкіх ваенных інтарэсаў»; 5) якая выкарыстоўвалася ў вытворчасці прадукцыі для насельніцтва акупаваных тэрыторый [21]. Працягласць працоўнага часу ў тыдзень была ўстаноўлена ўвогуле не менш за 54 гадзіны. Калі з пачаткам аперацыі «Барбароса» ў нямецкіх планах не прадугледжвалася татальнага прыцягнення працоўных рэсурсаў з акупаваных савецкіх тэрыторый, у тым ліку ў Беларусі, то з улікам новых задач, якія сталі ў парадак дня ў сувязі з працягам вайны на ўсходзе, «важным, вырашальным вытворчым фактарам з'явіўся чалавек», без выкарыстання якога германскія ваенныя і грамадзянскія органы ўлады не маглі пачаць «працоўны працэс» на акупаванай тэрыторыі [22].

Маштабы, геаграфія і формы прымянення беларускай працоўнай сілы становяцца відавочнымі ўжо ў 1942 г. Паміж аддзеламі працы грамадзянскай адміністрацыі, вярбовачнымі камісіямі, штабамі і іншымі германскімі ваенна-эканамічнымі службамі пачалася сапраўдная канкурэнцыя за працоўную сілу,

у якой усё больш востра адчувалі патрэбу як ў эканоміцы рэйха, так і на акупаванай тэрыторыі. Пры гэтым пастаўка рабочай сілы ў рэйх з'яўлялася больш прыярытэтнай задачай у параўнанні з яе выкарыстаннем на захопленай тэрыторыі. Калі ў першы год германскай акупацыі, з пункту погляду ўлад, назіраўся лішак рабочай сілы, то цягам 1942/43 гаспадарчага года пачаў адчувацца яе недахоп, асабліва кваліфікаваных спецыялістаў. Галоўнымі прычынамі такога становішча былі, па-першае, арганізаваны ў рамках праграмы генеральнага ўпаўнаважанага па выкарыстанні працоўнай сілы мэтавы вываз мясцовага насельніцтва і ваеннапалонных на работы ў рэйх; па-другое, значнае змяншэнне колькасці працоўнай сілы ў выніку гібелі ваеннапалонных, ліквідацыі яўрэяў і скарачэння мясцовага насельніцтва; па-трэцяе, больш шырокае прыцягненне мясцовай працоўнай сілы, асабліва працоўных рэсурсаў беларускай вёскі, для работ па аднаўленні прамысловай вытворчасці на акупаванай тэрыторыі Беларусі, па-чацвёртае, прыцягненне насельніцтва прыфрантавой зоны да ўзвядзення ліній палявых умацаванняў [23].

У адпаведнасці са статыстычнымі данымі ў 1942 г. агульная колькасць зарэгістраванай працоўнай сілы ў сельскай гаспадарцы Генеральнай акругі Беларусь складала 1 100 тыс. чалавек (30,6 % ад агульнай колькасці рабочай сілы ў рэйхскамісарыяце «Остланд»), пры гэтым мужчын было 385 тыс., ці 35,5 %, жанчын – 425 тыс., ці 38,6 %, з іх моладзі – 290 тыс., ці 26,4 %. Гэта лічба складала 45,8 % ад агульнай колькасці ўсяго ўлічанага насельніцтва Генеральнай акругі Беларусь [24]. Вясной 1943 г. агульная колькасць працоўнай сілы ў акрузе зменшылася да 650 тыс. чалавек, з якіх 470 тыс. чалавек (ці 72 %) былі заняты ў сельскай гаспадарцы [25].

На тэрыторыі эканамічнай інспекцыі «Цэнтр», размешчанай у Нова-Барысаве і дзеючай у тылавым раёне групы армій «Цэнтр» (Mitte), агульная колькасць занятых у сельскай гаспадарцы складала 2 654 тыс. чалавек, з якіх 1 844 тыс., ці 69,5 %, былі жанчыны і моладзь [26]. Больш паловы гэтай колькасці працоўнай сілы знаходзілася на акупаванай тэрыторыі Беларусі [27]. Доля занятых у кантэксце агульнай колькасці насельніцтва на тэрыторыі ўсходняй Беларусі (вобласць тылу групы армій «Цэнтр») налічвала 41 %, тады як у Генеральнай акрузе Беларусь – 45,6 % [28].

Дакументальныя матэрыялы паказваюць, што з першых тыдняў рэалізацыі плана «Барбароса» тэрыторыя Беларусі з яе застаўшымся эканамічным патэнцыялам і людскімі рэсурсамі апынулася галоўным аб'ектам эканамічнай эксплуатацыі для цэлага шэрага германскіх акупацыйных ваенна-эканамічных органаў і гаспадарчых служб, у тым ліку: трох гаспадарчых аддзелаў (IV Wi) пры галоўнакамандуючых (AOK) арміямі; сямі гаспадарчых груп (Gruppe IV Wi) пры палявых камендатурах, а таксама чатырох гаспадарчых каманд (Wi Kdos) з трыма філіяламі пры эканамічнай інспекцыі (Wi In) «Цэнтр»[1] [29]. Да перадачы захопленай тэрыторыі на захад ад Барысава ў рукі германскай грамадзянскай уладзе вайсковыя часці

[1] Падлічана аўтарам. – *С. Н.*

запусцілі свой акупацыйны механізм па эксплуатацыі пакінутага пасля частковай эвакуацыі прамысловага сельскагаспадарчага патэнцыялу БССР з яе людскімі рэсурсамі.

Тры гады германскай акупацыі, як вынікае з нямецкіх дакументаў, пераўтварылі грамадзянскае насельніцтва разам з савецкімі ваеннапалоннымі, якія апынуліся ў тыле групы армій «Цэнтр», а таксама з мясцовымі і дэпартаванымі з краін Еўропы яўрэямі ў галоўны суб'ект рабскай працы на месцах. Па стане на канец 1943 г. эканамічная інспекцыя «Цэнтр» валодала наступнай статыстыкай: агульная колькасць тых, хто выкарыстоўваўся ў германскіх інтарэсах у розных сферах прамысловай вытворчасці, лясной гаспадарцы, на абслугоўванні імперскай чыгункі, у будаўнічай арганізацыі «Тодта», занятых рамяством і працуючых у органах улады мясцовай адміністрацыі, а таксама абслугоўванні германскага вермахта (без дапаможных падраздзяленняў вермахта), складала звыш 550 тысяч чалавек. З больш за 1,5 млн чалавек, занятых летам 1942 г. у сельскай гаспадарцы, 38 % складалі мужчыны і 62 % – жанчыны [9, с. 86; 13, с. 135; 14, с. 398]. Такім чынам, найбольш маштабным з'яўлялася прыцягненне жыхароў беларускай вёскі да выканання абавязковых паставак для германскага вермахта.

Трагедыя грамадзянскага насельніцтва, якое знаходзілася на акупаванай тэрыторыі Беларусі, доўгія гады заключалася і ў тым, што дзеля захавання свайго далейшага жыцця і спрыяльнага забеспячэння лёсу сваіх родных, атрымання пэўнай пасады ў савецкім грамадстве многія павінны былі замоўчваць шматлікія факты ваеннага часу, у тым ліку гісторыі эканамічнага генацыду ў гады германскай акупацыі Беларусі. Гэта катэгорыя грамадзян часта не заўважаецца і цяпер, фактычна выключаецца з нацыянальнага пантэона гістарычнай памяці. У тых сем'ях, якія вынеслі на сваіх плячах цяжар паднявольнай працы на акупаванай тэрыторыі, і праз 75 гадоў пасля заканчэння вайны маўкліва захоўваецца памяць пра трагічныя лёсы соцень тысяч грамадзян Беларусі. Уключэнне гэтых імёнаў у агульны спіс ахвяр Вялікай Айчыннай вайны з'явілася б вельмі важным крокам па ўвекавечанні памяці аб гэтай суровай старонцы ў нацыянальнай хроніцы ваеннага мінулага і фарміраванні на якасна новым узроўні так неабходных элементаў сучаснай культуры памяці ў беларускім грамадстве XXI века.

## ЛІТАРАТУРА

1. Белорусские остарбайтеры: историко-аналитическое исследование / Г. Д. Кнатько [и др.]; под ред. Г. Д. Кнатько. – Минск: НАРБ, 2001. – 336 с.

2. Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944): Документы и материалы: в 2 кн. / сост. Г. Д. Кнатько [и др.]. – Минск : НАРБ, 1996. – Кн. 1 (1941–1942). – 304 с.

3. Белорусские остарбайтеры. Угон населения Беларуси на принудительные работы в Германию (1941–1944): Документы и материалы: в 2 кн. / сост. Г. Д. Кнатько [и др.]. – Минск : НАРБ, 1996. – Кн. 2 (1943–1944). – 472 с.

4. Белорусские остарбайтеры. Репатриация (1944–1951): Документы и материалы: в 2 ч. / сост. Г. Д. Кнатько [и др.]. – Минск : НАРБ, 1998. – Ч. 1. – 368 с.

5. Белорусские остарбайтеры. Репатриация (1944–1951): Документы и материалы: в 2 ч. / сост. Г. Д. Кнатько [и др.]. – Минск : НАРБ, 1998. – Ч. 2. – 310 с.
6. Беларусь в годы Великой Отечественной войны 1941 – 1945 / А. А. Коваленя (рук. авт. проекта), А. М. Литвин [и др.]. – Минск : БЕЛТА, 2005. – 544 с.
7. *Гребень, Е. А.* Привлечение нацистской Германией граждан Беларуси на принудительные работы (1941–1944 гг.): автореф. дис. ... канд. ист. наук: 07.00.02 / Е. А. Гребень; БГУ. – Минск, 2005. – 19 с.
8. Беларусь у перыяд Вялікай Айчыннай вайны: погляд у святле новых крыніц / аўт.-уклад.: Г. А. Болсун [і інш.] / пад. рэд. С. Я. Новікава, У. І. Лемяшонка. – Мінск : Медысонт, 2005. – С. 61–104.
9. *Літвін, А. М.* Вяртанне ў рабства: прымусовая праца насельніцтва Беларусі 1941–1945 гг. / А. М. Літвін, Я. А. Грэбень, С. Я. Новікаў; агул. рэд. А. М. Літвіна; пер.: В. А. Лойка, С. П. Паўлавіцкі. – Мінск: Тэсей, 2010. – 584 с.
10. *Dalhouski, A.* „Menschenmaterial“: Arbeitseinsatz der belarussischen Zwangsarbeiter unter der nationalsozialistischen Herrschaft. Magisterarbeit / A. Dalhouski. – Aachen, 2008. – S. 41–42.
11. *Herbert, U.* Zwangsarbeit im 20. Jahrhundert. Begriffe, Entwicklung, Definitionen / U. Herbert // Zwangsarbeit in Hitlers Europas. Besatzung, Arbeit, Folgen / Hrsg. von Dieter Pohl und Tanja Sebta. – Berlin : Metropol, 2013. – S. 31–33.
12. *Novikau, S.* Wirtschaftliche Ausbeutung und Zwangsarbeit in Weissrussland während der deutschen Besatzung von 1941–1944 / S. Novikau // Zwangsarbeit in Hitlers Europas. Besatzung, Arbeit, Folgen / Hrsg. von Dieter Pohl und Tanja Sebta. – Berlin : Metropol, 2013. – S. 129–163.
13. *Новікаў, С. Я.* Колькасныя маштабы прыцягнення беларускага насельніцтва нямецкай ваеннай адміністрацыяй да прымусовай працы на тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.) / С. Я. Новікаў // Разняволеная памяць. Прымусовая праца беларускіх грамадзян на акупаванай тэрыторыі Беларусі (1941–1944 гг.): зб. навук. артыкулаў / пад рэд. А. М. Літвіна. – Мінск : Медысонт, 2010. – С. 83–135.
14. *Новиков, С. Е.* Ужесточение нацистского оккупационного режима на территории Беларуси / С. Е. Новиков // Страна в огне: в 3 т. – М. : Абрис, 2018. – Т. 2: Коренной перелом. 1942–1943 : в 2 кн. Кн. 1: Очерки / отв. ред. А. М. Литвин, Ю. А. Никифоров – С. 360–428.
15. Aus den Richtlinien des Wirtschaftsführungsstabes Ost (Grüne Mappe, Teil I) über die Zwangsarbeit der Bevölkerung in den besetzten sowjetischen Gebieten, Juni 1941 // Okkupation, Raub, Vernichtung: Dokumente zur Besatzungspolitik der faschistischen Wehrmacht auf sowjetischem Territorium 1941 bis 1944 / Hrsg. von Norbert Müller. – Berlin : Militärverlag, 1980. – S. 279–281.
16. *Gerlach, Ch.* Kalkulierte Morde. Die deutsche Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrussland 1941 bis 1944 / Ch. Gerlach. – Hamburg : Hamburger Edition, 1999. – 1232 S.
17. Российский государственный военный архив. – Ф. 1358 К. Оп. 4. Д. 1: BfdVP, Wi Fü Stab Ost, V.P.19206/6 g v. 20.11.41 (Abschrift). – Л. 42–51.

18. Bundesarchiv-Militärarchiv (далее – BA-MA). – RW 31/85: RM d GR. Beauftragter für den Vierteljahresplan. Wirtschaftsführungsstab Ost, V.P. 19203/6 g. – Bl. 74;
19. Aus der Richtlinien von Hinrich Lohse, Reichskommissar für das Ostland, vom 13. August 1941 für die Behandlung jüdischer Bürger // Die faschistische Okkupationspolitik in den zeitweilig besetzten Gebieten der Sowjetunion (1941–1944) / Dokumentenauswahl und Einleitung von Norbert Müller unter Mitarbeit von Uwe Löbel und Ulrich Freye. – Berlin: Deutscher Verlag der Wissenschaften, 1991. – S. 188.
20. Справочник о местах принудительного содержания гражданского населения на оккупированной территории Беларуси 1941–1944 / авт.-сост. В. И. Адамушко [и др.].: науч. ред. Р. П. Платонов, В. И. Адамушко. – Минск: НАРБ, 2001. – С. 7.
21. Национальный архив Республики Беларусь (далее – НАРБ). – Ф. 378. Оп. 1. Д. 189: Der Beauftragte für VJP; Der Generalbevollmächtigte für den Arbeitseinsatz, Va 5550/611 v. 14.09.42: Anordnung Nr. 10 des GBA über den Einsatz von Arbeitskräften der besetzten Ostgebieten. – Л. 9.
22. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzten sowjetischen Gebieten 1941–1943 / Hrsg. von Rolf-Dieter Müller. – Boppard a. Rh.: Harald Boldt Verlag, 1991. – S. 347.
23. Verordnung über Arbeitspflicht und Arbeitseinsatz im Operationsgebiet der neu besetzten Ostgebiete // Die deutsche Wirtschaftspolitik in dem besetzten sowjetischen Gebieten 1941–1943 / Hrsg. und eingeleitet von Rolf-Dieter Müller. – Boppard am Rhein, 1991. – S. 301.
24. BA-MA. – RW 31/306: Wi Stab Ost, Chefgr, La 2a 3 und RMfbO, III E 2a: Die Landwirtschaft in den besetzten Ostgebieten. Statistik der landwirtschaftlichen Erzeugung 1942. – Bl. 17.
25. Die wirtschaftliche Lage in Weißruthenien, in: Protokoll über die Tagung der Gebietskommissare, Hauptabteilungsleiter und Abteilungsleiter des Generalkommissars in Minsk vom 8. April bis 10 April 1943 // Стенограмма совещания высшего руководства Генерального округа «Белоруссия» (Минск, 8–10 апреля 1943 года) / авт.-сост.: С. В. Жумарь, С. Е. Новиков, Р. А. Черноглазова; пер. с нем.: Г. Н. Белькевич, О. А. Лойко, С. Е. Новиков, С. П. Павловицкий. – Минск, 2006. – S. 24.
26. BA-MA. – RW 31/306: Wi Stab Ost, Chefgr, La 2a 3 und RMfbO, III E 2a: Die Landwirtschaft in den besetzten Ostgebieten. Statistik der landwirtschaftlichen Erzeugung 1942. – Bl. 17.
27. BA-MA. – RW 31/558: Wi In Mitte, Chefgruppe Fü / Abt. Arbeit, Az.: 4200 v. 31.3.42: Lagebericht für Monat März 1942 (Anlage 1). – Bl. 2.
28. BA-MA. – RW 31/562: Wi In Mitte, Chefgruppe Arbeit: Grundlagen für Arbeitseinsatzplanung v. 31.12.42. – Bl. 304.
29. НАРБ. – Ф. 412. Оп. 1. Д. 21: Wi In Mitte. Besondere Anordnung Nr. 1 v. 12.7.41. – Л. 81–87.

*Поступила в редакцию 01.04.2020*